


Март 1918 года.

# НА ИЗЛОМЕ ИСТОРИИ...

Министерство культуры Республики Беларусь

ГУ «Мемориальный комплекс «Брестская крепость-герой»

УО «Брестский государственный университет
имени А.С. Пушкина»

УК «Брестская областная библиотека имени М. Горького»

# МАРТ 1918 ГОДА. НА ИЗЛОМЕ ИСТОРИИ…

**Материалы международной научно-практической конференции исследователей, преподавателей, музейных, библиотечных и архивных работников**

(Брест, 14–15 марта 2018 года)

*Посвящена 100-летию подписания Брестского мира*

Брест
«Альтернатива»
2018

УДК 94(476)"1918"(082)
ББК 63.3(4Беи)61я43
М29

*Рекомендовано научно-методическим советом государственного учреждения «Мемориальный комплекс «Брестская крепость-герой»*

*Редакционная коллегия:*
директор мемориального комплекса «Брестская крепость-герой» **Г.Г. Бысюк**;
доктор исторических наук, заведующий кафедрой истории славянских народов Брестского государственного университета имени А.С. Пушкина **А.Н. Вабищевич**;
заместитель директора по научной работе мемориального комплекса «Брестская крепость-герой» **Л.Г. Бибик**;
ученый секретарь **Е.В. Харичкова**;
заместитель директора УК «Брестская областная библиотека имени М. Горького» **А.М. Мяснянкина**

*Рецензенты:*
кандидат исторических наук, заведующая кафедрой всеобщей истории Брестского государственного университета имени А.С. Пушкина **Е.И. Пашкович**;
кандидат исторических наук, доцент, заведующий кафедрой гуманитарных наук Брестского государственного технического университета **А.В. Мощук**

**Март 1918 года**. На изломе истории... : материалы междунар. науч.-
М29 практ. конф. исслед., препод., музейн., библиот. и арх. раб. (Брест, 14–15 марта 2018 г.) ; редкол.: Г. Г. Бысюк [и др.]. – Брест : Альтернатива, 2018. – 124 с.; [8] л. ил.

ISBN 978-985-521-647-7.

В сборник включены статьи историков, сотрудников музейных и архивных учреждений, посвященные 100-летию подписания Брестского мира.

Адресован ученым, преподавателям высших и средних учебных заведений, студентам, музейным и библиотечным работникам, краеведам, всем, кто интересуется историей Первой мировой войны.

**УДК 94(476)"1918"(082)**
**ББК 63.3(4Беи)61я43**

**ISBN 978-985-521-647-7**

© ГУ «Мемориальный комплекс «Брестская крепость-герой», 2018
© Оформление. ЧПТУП «Издательство Альтернатива», 2018

**Г.Г. Бысюк,**
*директор ГУ «Мемориальный комплекс «Брестская крепость-герой»*

# БРЕСТСКИЙ МИР

175-летняя история Брестской крепости насыщена интересными событиями, порой трагическими, героическими. Происходившее на земле крепости часто имело важное историческое значение. В начале XX века, в период Первой мировой войны и свершившейся Октябрьской революции таким знаковым событием стал Брестский мир, подписанный в здании Белого дворца.

В фондовых коллекциях мемориала хранятся уникальные музейные предметы, поступившие в разные годы XX века и наступившего XXI. Это фотографии, книги, написанные очевидцами событий и кинодокументы, которые являются источниками наших знаний, бесценным материалом истории. К сожалению, реалии таковы, что многие члены делегаций позже были репрессированы и реабилитированы посмертно.

100 лет назад, 3 марта 1918 года в здании Белого дворца в Брестской крепости в 17.50 был подписан мирный договор между Советской Россией и странами Четверного союза – Германией, Австро-Венгрией, Турцией и Болгарией. На заключительном этапе переговоров делегацию возглавил Григорий Яковлевич Сокольников. В её составе были Чичерин Георгий Васильевич, Петровский Григорий Иванович, Карахан Лев Михайлович и военный эксперт Альтфатер Василий Михайлович. В качестве консультанта в делегацию был включен Иоффе Адольф Абрамович.

6 марта 1918 года открылся VII съезд Коммунистической партии. Доклад о войне и мире сделал В.И. Ленин. На съезде вновь развернулась ожесточенная борьба между сторонниками и противниками Брестского договора. В итоге делегаты признали необходимым утвердить Брестский мирный договор.

14 марта 1918 года состоялся IV Всероссийский съезд Советов, который большинством голосов постановил ратифицировать Брестский договор.

Советская республика выходила из войны и получала крайне необходимую ей мирную передышку.

9 ноября 1918 года всеобщая забастовка рабочих в Германии переросла в вооруженное восстание. В тот же день Вильгельм II подписал акт об отречении от престола, а 11 ноября Германия капитулировала.

**А.М. Вабішчэвіч,**
*доктар гістарычных навук,*
*прафесар, загадчык кафедры*
*гісторыі славянскіх народаў*
*УА «Брэсцкі дзяржаўны*
*ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»*

# БРЭСЦКІ МІР І БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ

Значэнне Брэсцкага міра 1918 г. у лёсе беларускага народа ўжо з'яўлялася прадметам навуковага даследавання ў айчыннай гістарычнай навуцы [17; 9; 13; 16]. Аднак варта яшчэ раз прааналізаваць падзеі 100-гадовай даўніны, каб высветліць адказы на шэраг пытанняў, асабліва звязаных з рэальнай магчымасцю беларускага нацыянальнага руху паўплываць на ход перамоўнага працэсу, на вынікі мірнага дагавора.

Мірныя перамовы ў Брэст-Літоўску (Брэсце) у канцы 1917 – пачатку 1918 г. праходзілі ва ўмовах, калі на абшары былой Расійскай імперыі, «турмы народаў», актывізаваўся нацыянальны рух. З вясны 1917 г. ажывіўся беларускі нацыянальны рух, у тым ліку ў асяроддзі шматлікіх бежанцаў-беларусаў у расійскіх губернях, вайскоўцаў на франтах. Абвешчанае савецкім урадам у Дэкрэце аб міры і Дэкларацыі правоў народаў Расіі права нацый на самавызначэнне стварала новыя магчымасці для нацыянальных рухаў. Асобна нацыянальна-культурную, дабрачынную і іншую дзейнасць праводзілі беларускія арганізацыі на тэрыторыі, акупаванай нямецкімі войскамі, якія мелі адносна іх свае кан'юнктурныя інтарэсы.

На момант правядзення мірных перамоў у Брэсце яшчэ не было асобнага беларускага дзяржаўнага ўтварэння. І Усебеларускі з'езд у снежні 1917 г. не прымаў рашэння аб стварэнні незалежнай беларускай дзяржавы. Яго дэлегаты паспелі прагаласаваць толькі за першы пункт рэзалюцыі – «Аб уладзе». Яны прынялі рашэнне аб устанаўленні ў Беларусі рэспубліканскага ладу, прызнавалі цэнтральны савецкі ўрад, што падтрымаў правядзенне з'езда, і не прызнаваў Аблвыканкамзах, які ў сваю чаргу не хацеў дзяліцца ўладай з прадстаўнікамі беларускага народа і самавольна разагнаў з'езд. Пазіцыю дэлегатаў з'езда рэзка раскрытыкаваў савецкі ўрад і запатрабаваў правесці новы з'езд [8; 5, с. 43]. Аднак Усебеларускі з'езд «прадэманстраваў самыя важныя каштоўнасці, якія маюць значэнне для нас да цяперашняга дня: свая дзяржава, яе сацыяльны характар і той факт, што толькі народ,

яго воля, калектыўны розум і лідары могуць стаць сапраўднай крыніцай незалежнасці» [11]. З'езд прадстаўляў тагачаснае беларускае грамадства, яго правядзенне сведчыла аб развіцці беларускага нацыянальнага руху. Гэта было пацвярджэннем, што беларускае пытанне станавілася важным палітычным фактарам [5, с. 40].

Сярод шэрагу пытанняў на І Усебеларускім з'ездзе дэлегатамі закраналася пытанне аб прысутнасці беларускіх прадстаўнікоў на мірных перамовах для захавання цэласнасці, непадзельнасці Беларусі, яе непарыўнасці з Расійскай Федэратыўнай Рэспублікай, усіх іншых прынцыпаў дэмакратычнага міра, абвешчаных Савецкай уладай, пастаноўкі пытання аб кампенсацыі ўрону, панесенага беларускім насельніцтвам у час Першай сусветнай вайны.

12 снежня 1917 г. Я. Серада зрабіў пазачарговую заяву ад імя палітычнай секцыі аб неадкладным абмеркаванні пытання аб умяшальніцтве ў мірныя перамовы для адстойвання інтарэсаў Беларусі. Я. Варонка ўзнімаў пытанне аб мяркуемым далучэнні Гродзенскай і Віленскай губерній да Літвы. Ф. Шантыр прапанаваў тэрмінова звязацца з Л. Троцкім. Вучоны Я. Карскі заявіў аб тым, што пасля хвалі бежанства і высялення ўцалелых жыхароў у Германію на тэрыторыі Гродзенскай і Віленскай губерній засталося мала насельніцтва, якое Германія можа прымусіць прызнаць уладу Літвы. Таму ён таксама дамагаўся тэрмінова даведацца ў Л. Троцкага аб сутнасці перамоў. «Неабходны кантроль за мірнымі перамовамі, – сцвярджаў Я. Карскі. – Мной ужо складзена карта Беларусі, у якой дакладна абазначана мяжа рассялення беларусаў». Ад дэлегатаў прагучала прапанова не чакаць нейкіх дазволаў, а самастойна прыняць удзел у мірных перамовах, паслаць туды прадстаўнікоў. А. Цвікевіч таксама лічыў патрэбным павесці перамовы з Л. Троцкім. Аднак, паводле А. Цвікевіча, пытанне аб прадстаўніцтве на мірных перамовах можа быць вырашана ў Германіі. «З намі ж не лічацца, – меркаваў ён. – З гэтай нагоды неабходна перагаварыць з украінцамі». Рашуча былі настроены адстойваць беларускія землі Т. Грыб («Ніхто не мае права дзяліць нас. Хто мае права што-небудзь вырашаць за нас?»), А. Вазіла («Калі гандлююць Беларуссю – мы памром, але не аддадзім сваёй зямлі»). Я. Серада прапанаваў даручыць перамовы прэзідыуму з'езда, Я. Сушынскі – за неадкладнае аб'яўленне Беларускай рэспублікі і пачатак самастойных перамоў, З. Жылуновіч – аб выбранні дэлегатаў на мірныя перамовы і «тады давесці да ведама т. Троцкага». Прагаласавалі за 3 пункты: «1) даручыць прэзідыуму перамовы з тав. Троцкім; 2) паслаць у Петраград дэлегатаў для пастаяннай інфармацыі; 3) паслаць дэлегатаў на мірную канферэнцыю». Аднак А. Гарун (Прушынскі) адзначыў, што

самім трэба дамовіцца і патрабаваць тады, што патрэбна. Таму зноў галасаваннем пункты 2 і 3 адклалі да скончэння перамоў з Л. Троцкім [3].

У час працы з'езда яго старшыня А. Савіч гутарыў па тэлефоне з савецкім наркамам па справах нацыянальнасцей І. Сталіным. У сваю чаргу І. Сталін заверыў: «Наогул, беларускія таварышы не павінны хваляваць, яны павінны ведаць, што савет народных камісараў будзе абараняць інтарэсы працоўных мас Беларусі ўсімі сродкамі». Таксама ён пацвердзіў права беларусаў на самастойную пастаноўку любых пытанняў свайго дзяржаўнага існавання, у тым ліку і аб аддзяленні ад Расіі [4]. Аднак разгон з'езда прывёў да таго, што ў беларускіх дзеячаў значна абмежаваліся магчымасці ўплываць на ход мірных перамоў у Брэсце [16, с. 56–57].

У брашуры «Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики» А. Цвікевіч адзначаў, што «Усебеларускі з'езд першую частку сваёй задачы ажыццявіў. «У прысутнасці сатрапаў з «Савета», пад пагрозай штыкоў і расстрэлу з бранявіка, ён аднагалосна... вынес рэзалюцыю «аб зацвярджэнні на беларускай зямлі рэспубліканскага ладу», аб непадзельнасці Беларусі і аб замацаванні за яе грамадзянамі асноўных правоў, заваяваных рэвалюцыяй» [19, с. 10].

Беларускае пытанне на мірных перамовах у Брэсце ўздымалася аднойчы, калі нямецкі генерал М. Гофман выкарыстаў інфармацыю аб разгоне І Усебеларускага з'езда для ціску на савецкую дэлегацыю. Аднак быў задаволены тлумачэннем Л. Троцкага – маўляў, з'езд разагналі самі беларускія салдаты. Выканкам І Усебеларускага з'езда, што знаходзіўся на нелегальным становішчы пасля разгону з'езда, выказаў пратэст з нагоды зневажальных для беларусаў выказванняў Л. Троцкага: з'езд разагналі «сатрапы камісараў Заходняй вобласці», а заява Л. Троцкага – гэта «гнусная хлусня і мана, нявартая сацыяліста». Грэблівае стаўленне ўдзельнікаў перамоў да падзей, што адбываліся на Беларусі, выклікалі абурэнне з боку беларускіх дзеячаў. Паводле А. Ціхамірава, сам ход перамоў у Брэсце і іх вынікі радыкалізавалі пазіцыю прыхільнікаў беларускай дзяржаўнасці [16, с. 44].

Для савецкага боку беларускае пытанне не мела вялікай значнасці. Не надавала вялікай увагі беларускаму пытанню і Германія. З беларускім нацыянальным рухам немцы сутыкнуліся толькі з восені 1915 г. І сур'ёзную падтрымку яны аказвалі станаўленню менавіта літоўскай дзяржавы, куды ўключалася і частка заходніх зямель Беларусі. У адрозненне ад камандавання Х нямецкай арміі, якая дыслакавалася на беларускіх землях, і акупацыйнай адміністрацыі, якія імкнуліся выкарыстоўваць магчымасці беларускіх арганізацый для ўласных

кан'юнктурных акупацыйных мэтаў, цэнтральны нямецкі ўрад беларускае пытанне лічыў інтрыгай і не рабіў на яго стаўку [18, с. 9].

У студзені 1918 г. выканкам Рады Усебеларускага з'езда, існуючы нелегальна, накіраваў неафіцыйную дэлегацыю (Я. Сераду, А. Цвікевіча, С. Рака-Міхайлоўскага) на мірныя перамовы ў Брэст-Літоўск з наказам абароны і захавання правоў пры падпісанні міра на аснове адзінства і непадзельнасці Беларусі як раўнапраўнай і аўтаномнай часткі Расійскай Дэмакратычнай Федэратыўнай Рэспублікі [6, с. 88; 7, с. 209]. Можна пагадзіцца з думкай, што быў зроблены першы, хоць і безвыніковы, практычны крок у справе абароны непадзельнасці Беларусі як гістарычна аформленай тэрытарыяльна-этнічнай дзяржаўнай адзінкі [5, с. 42].

Дэлегатам да месца перамоў давялося дабірацца пешшу [6, с. 88; 7, с. 209; 14, с. 7]. А. Цвікевіч разам з С. Ракам-Міхайлоўскім пешшу перайшоў лінію фронта каля Баранавіч. «Нямецкая вайсковая часць, што там стаяла, прыняла іх, як трэба, падрыхтаваўшы ўжо і вагон для ад'езду ў Берасце, як раптам пасля тэлеграфнага запытання атрымала паведамленне, што Троцкі... ніякай Беларусі не прызнае...» [15, с. 84–85]. Як згадваў С. Рак-Міхайлоўскі, вярнуўшыся з Пагарэльцаў пасля няўдалай спробы праехаць у Брэст праз Баранавічы, яны даведаліся, што з 27 па 28 снежня (паводле старога стылю) 1917 г. былі арыштаваны некаторыя члены Беларускай вайсковай рады [10, с. 74]. Так як дэлегаты маглі быць арыштаваны СНК Заходняй вобласці, то беларускія дзеячы вырашылі дзейнічаць дыпламатычнымі сродкамі, дабрацца да месца перамоў праз Украіну. Такім чынам, беларуская дэлегацыя акружной дарогай, праз Украіну, трапіла ў Брэст. У пасяджэнні яны не ўдзельнічалі, бо на гэта не пагадзіўся Л. Троцкі, які тлумачыў адмову тым, што Беларусь не прызнана Савецкай Расіяй, а значыць складае частку Расіі [12, с. 186]. Беларускія дэлегаты змаглі ўзяць удзел толькі ў якасці назіральнікаў з украінскага боку.

«Не пусціў нас Троцкі прыехаць у Брэст праз Баранавічы як беларусаў, так мы паехалі тады праз Кіеў, – адзначалі А. Цвікевіч і С. Рак-Міхайлоўскі. – Але Кіеў у той час... ужо забраны быў бальшавікамі, і вось з небяспекай для жыцця мы рушылі ў Жытомір, дзе ў той час была Рада Міністраў Украіны, узялі ад іх пасведчанні, што мы едзем у Брэст як кансультанты ўкраінскай дэлегацыі... За часы доўгай нашай вандзраванні ў дарозе, пакуль мы прыехалі, перамовы былі перарваны, і мы прыехалі на чацвёрты дзень пасля ад'езду Троцкага і К°. Кюльмана і Розенберга на гэты час таксама не стала ўжо ў Брэсце» [2, арк. 26; 10, с. 74].

15 (28) лютага 1918 г. ад імя «дэлегацыі ад беларусоў у Берасьці» С. Рак-Міхайлоўскі пісаў у лісце ў Мінск да Рады Усебеларускага з'езда

сялянскіх, вайсковых і рабочых дэпутатаў наступнае: «... папалі мы сюды, як у астрог; нам нават адмаўляюцца даць дазваленне з'ездзіць у Вільню, пад усякімі вымысламі» [2, арк. 25; 10, с. 73].

Заклапочаныя праблемамі ў Брэст-Літоўску, А. Цвікевіч і С. Рак-Міхайлоўскі не ведалі пра тыя падзеі, што адбываліся ў Мінску. Пра гэта сведчыць іх ліст, што датуецца 28 лютым 1918 г.: «Дарагія браты! Надта трудна была наша праца ў палітычным кірунку ад таго, што нам было невядома аб палажэнні беларускага пытання ў Вас, за кардонам. Толькі сёння, прачытаўшы Вашу газету «Гоман», мы даведаліся, што ў Вас адбылася Канферэнцыя, на якой было прызнана патрэбным дабівацца Беларускай незалежнай Рэспублікі [2, арк. 28; 10, с. 75]. Звесткі гэтыя надта глухія, таму просім Вас паведаміць нам дэтальна, які змест Вы ўкладаеце ў паняцце незалежнасці і як Вы мысліце сабе шлях да гэтага. Справа ў тым, што мы ясна ўсведамляем са свайго боку, што... ні палітычна, ні эканамічна беларускі народ жыць незалежна не можа: ён слабы сіламі культурнымі і бедны эканамічна» [2, арк. 25–26; 10, с. 75–76].

А. Цвікевіч і С. Рак-Міхайлоўскі падалі кароткую даведку пра гісторыю беларускага руху і пра становішча беларускага пытання да лютага 1918 г. прадстаўніку нямецкай дэлегацыі Шылеру [14, с. 7]. «Звярнуліся мы да Шылера, паведамілі яго аб усім, што дзеецца ў нас (усё гэта неафіцыйна падалі яму) і запыталіся ў яго, у якім палажэнні стаіць пытанне суцэльнай, непадзельнай Беларусі. Ён нам адказаў, што мы трохі спазніліся, што праект мірнага дагавора ўжо апрацаваны, застаецца толькі яго падпісаць, але Троцкі збег» [2, арк. 26; 10, с. 74].

Як бачым, беларускія прадстаўнікі прыбылі ў Брэст, калі перамовы былі фактычна скончаны. Яны змаглі сустрэцца з членамі нямецкай дэлегацыі і перадалі ім мемарандум з ідэяй непадзельнай беларускай этнаграфічнай тэрыторыі, выказвалі незадаволенасць адарваннем ад Беларусі заходніх і паўднёвых зямель. Нямецкі бок у сваю чаргу слаба адрэагаваў на гэта і лічыў, што мірны дагавор істотна не закранае інтарэсы беларусаў, не збіраўся ўносіць у тэкст нейкія змены. А савецкі прадстаўнік Л. Карахан адмовіўся сустракацца з беларускімі дзеячамі. «Мы сваім прыездам ужо трохі перамітусілі карты і толькі шкада, што трохі спазніліся, але наша мэта – незалежнасць Беларусі ў этнаграфічных яе граніцах – ужо зрабіла ўражэнне на немцаў і ўчора вечарам Карахан па тэлефоне адмовіўся з намі гаварыць доўга, кажучы, што «мне вядомы тыя мэты, з якімі Вы прыехалі», – паведамлялі беларускія прадстаўнікі ў Мінск [2, арк. 25–26; 10, с. 75–76].

Украінскія дзеячы першапачаткова падтрымлівалі беларускіх прадстаўнікоў, якія і трапілі ў Брэст менавіта як назіральнікі з украінскага боку. Тыя ж А. Цвікевіч, С. Рак-Міхайлоўскі ўжо пасля заключэн-

на Брэсцкага міра былі ўключаны ў накіраваную ў Кіеў спецыяльную дыпламатычную місію БНР. У ходзе дзейнасці гэтай місіі вырашаліся пытанні беларуска-ўкраінскай мяжы, аб прызнанні абвешчанай беларускай дзяржаўнасці і пераглядзе Брэсцкага міра, праводзіліся перамовы з місіямі іншых дзяржаў наконт фінансавай дапамогі ўраду БНР [7, с. 210]. Аднак характар адносін з украінскімі дзяржаўнымі структурамі ўскладніўся, асабліва пасля разгону Цэнтральнай рады і зацвярджэння ўлады гетмана П. Скарападскага. С. Рак-Міхайлоўскі 20 красавіка 1918 г. адзначаў: «Перыяд рамантычных адносінаў украінцаў да беларусаў (цяпер Урад Украінскі) прайшоў; выступае на сцэну бязлітасная рэальная палітыка, дзе права на самавызначэнне можа ў слаба арганізаванай Беларусі пацярпець» [1, с. 110].

Такім чынам, дэлегацыя Германіі і іншыя ўдзельнікі мірных перамоў у Брэсце не прызналі паўнамоцтваў дэлегацыі выканкама Рады Усебеларускага з'езда. У адрозненне ад УНР, да пачатку і ў ходзе перамоўнага працэсу не адбылася інстытуалізацыя БНР. Беларускае пытанне ўдзельнікі перамоў лічылі ўнутранай справай Расіі, дзе права беларусаў на самавызначэнне сур'ёзна не прызнавалі палітычныя партыі рознай арыентацыі. Сапраўды, Брэсцкі мірны дагавор быў падпісаны без уліку думкі беларускіх прадстаўнікоў, што стала вынікам агульнай палітычнай слабасці выканкама Рады Усебеларускага з'езда і адсутнасці ў яго рэальнай улады [14, с. 7]. Гэтым у многім тлумачыцца безвыніковасць спробы ўдзелу беларускіх дзеячаў у перамоўным працэсе ў Брэсце.

Аднак неабходна аддаць належнае захадам беларускіх прадстаўнікоў, якія не выступалі супраць мірных перамоў, бо беларускі народ меў велізарныя людскія, матэрыяльныя страты ад вайны, моцна цярпеў ад наступстваў вайны, значная яго частка знаходзілася ў бежанстве. Яны беспаспяхова імкнуліся, каб Беларусь была паўнавартасным суб'ектам таго перамоўнага працэсу. У тагачасных геапалітычных умовах, калі ў беларусаў толькі адбывалася станаўленне дзяржаватворчых працэсаў, ніхто з удзельнікаў перамоў у Брэсце істотна не падтрымаў іх памкненні аб цэласнасці, непадзельнасці ўласнай тэрыторыі. Мяркуем, што ўжо даўно варта было ўшанаваць у г. Брэсце імя яго ўраджэнца – беларускага грамадска-палітычнага дзеяча, юрыста, гісторыка, публіцыста Аляксандра Іванавіча Цвікевіча, старшыні Рады Міністраў БНР у 1923–1925 гг.

## КРЫНІЦЫ І ЛІТАРАТУРА:

1. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. – Т. 1. – Кн. 1. – Вільня – Мінск – Нью-Ёрк – Прага, 1998. – 866 с.

2. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). – Фонд 3. Воп. 1. Спр. 261. Арк. 25–28.

3. Белорусская рада. – 1917. – № 9 (14 декабря).
4. Белорусская рада. – 1917. – № 10 (16 декабря).
5. Брыгадзін, П. І. Першы Усебеларускі з'езд (снежань 1917 г.): да стагоддзя // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Гісторыя. – 2017. – № 3. – С. 37–43.
6. Вабішчэвіч, А. М. Рак-Міхайлоўскі, С. А. / А. М. Вабішчэвіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск : БелЭн, 2001. – Т. 6, кн. 1. – С. 88–89.
7. Вабішчэвіч, А. Аляксандр Цвікевіч (1883–1937) / А. Вабішчэвіч // Białoruskie zeszyty historyczne. Nr. 14. – Białystok : Białoruskie Towarzystwo Historyczne, 2000. – S. 208–219.
8. Гигин, В. Могла ли состояться БССР в 1917 году? / В. Гигин // Беларуская думка. – 2009. – № 12. – С. 62–71.
9. Ладысеў, У. Ф. Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.) / У. Ф. Ладысеў, П. І. Брыгадзін. – Мінск : Выд-ва БДУ, 2003. – 307 с.
10. Лісты С. Рака-Міхайлоўскага // Спадчына. – 1993. – № 3. – С. 73–76.
11. Лукашенко, А. Г. Приветствие гостям и участникам конференции «События 1917 года в исторических судьбах Беларуси» / А. Г. Лукашенко [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.president.gov.by/ru/news_ru/view/privetstvie-gostjam-i-uchastnikam-konferentsii-sobytija-1917-goda-v-istoricheskix-sudbax-belarusi-17584/. – Дата доступа: 10.02.2018.
12. Міхалюк, Д. Беларуская Народная Рэспубліка ў 1918–1920 гг.: ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці / Д. Міхалюк. – Смаленск : Інбелкульт, 2015. – 495 с.
13. Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе / М. П. Касцюк [і інш.]; рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 615 с.
14. Пашкевіч, А. Сымон Рак-Міхайлоўскі: старонкі жыцця і дзейнасці / А. Пашкевіч // Куфэрак Віленшчыны. – Маладзечна, 2007. – № 1 (12). – С. 4–30.
15. Спадчына. – 1998. – № 1.
16. Тихомиров, А. В. Брестский мир 1918 г. и Беларусь / А. Тихомиров // Белорусский журнал международного права и международных отношений. – 1999. – № 2. – С. 44–57.
17. Траццяк, С. А. Брэсцкі мір і грамадска-палітычныя працэсы ў Беларусі: лістапад 1917 – студзень 1919 г. / С. А. Траццяк. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 208 с.
18. 1918-ы год для нашай дзяржаўнасці: набыткі і страты // Звязда. – 2018. – 17 студзеня. – С. 8–10.
19. Цвикевич, А. Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики / А. Цвикевич. – Киев, 1918. – 16 с.